Ю. В. Маліцкі
г. Мінск

# БЕЛАРУСКІ МЕДЫЯТЭКСТ: МОЎНАЯ СУТНАСЦЬ

У працэсе гістарычнага развіцця медыятэкст прайшоў шлях ад лапідарных паведамленняў камерцыйнага характару, разлічаных на абмежаваную групу людзей, да высокатэхналагічнай культурнай з'явы поліфункцыянальнага прызначэння з патэнцыяльна глабальным ахопам аўдыторыі. Вытокі беларускага інфармацыйна-публіцыстычнага (медыйнага) тэксту бяруць пачатак у часы, калі роля інфармацыі ў соцыуме і характар яе данясення да шырокіх слаёў насельніцтва мелі значэнне не толькі ў плане азнаямлення з актуальнымі навінамі, але і ў плане факусіроўкі погляду на гэтыя падзеі з пазіцый грамадзянскай свядомасці і нацыянальнай ідэі.

Гісторыя беларускай журналістыкі не мае адзінага погляду на праблему вызначэння часу выхаду першага беларускага інфармацыйнага выдання і, адпаведна, часу ўзнікнення айчыннага медыятэксту. У якасці ідэнтыфікацыйных рыс першых сродкаў масавай камунікацыі айчынныя даследчыкі называюць друкаваны характар, спецыфічныя зместавыя асаблівасці, перыядычнасць выхаду, лакалізацыю і інш. Згадваецца і моўны фактар. У адных выпадках ён лічыцца адным з асноўных, у іншых – неістотным у параўнанні, напрыклад, з фактарам месца друкавання і тэрыторыяй распаўсюджання.

Прыярытэт моўнага фактару ў аспекце фарміравання феномена медыйнага тэксту бачыцца нам цалкам натуральным і абгрунтаваным. Сапраўды, глыбокі і ўсебаковы аналіз тэкстаў сродкаў масавай камунікацыі, побач з разглядам камунікатыўных, семіятычных і іншых адзнак, немагчымы без аналізу іх лінгвістычных рыс у кантэксце часавых абставін. Мова як ключавы

інструмент журналісцкай дзейнасці з’яўляецца падмуркам кагнітыўна-персуазіўнай структуры медыятэксту. Яна вызначае ілакутыўны і перлакутыўны эфекты публіцыстычнага матэрыялу і акрэслівае рэчышча развіцця публіцыстыкі як віду нацыянальнай грамадска-палітычнай літаратуры. Калі шырокае інфармацыйнае ўзаемадзеянне праз сродкі масавай камунікацыі лічыцца адным з асноўных паказчыкаў высокага развіцця грамадства, то мова, якая ў канкрэтны перыяд забяспечвае паўнавартаснае функцыянаванне інфармацыйнай прасторы, рэпрэзентуе сябе як поўнасцю сфарміраваная аўтаномная сістэма, здольная актуалізаваць нават самыя тонкія адценні зместу і прагматыкі.

Беларуская мова ў адпаведных гістарычных формах адной з першых на славянскіх землях даказала сваю здольнасць эфектыўна выступаць у якасці сродку шырокага інфармацыйнага абмену, рэалізуючы актуальныя камунікатыўныя інтэнцыі актараў маўленчага ўзаемадзеяння. Фармалізуючы грамадскую камунікацыю праз мову, блізкую большасці насельніцтва беларускіх земляў, інфармацыйна-публіцыстычныя выданні выконвалі важную функцыю кансалідацыі беларускага соцыуму на нацыянальным культурным і лінгвістычным падмурку. “Гістарычны вопыт сведчыць, што асноўнымі фактарамі фарміравання самасвядомасці беларускага этнасу былі родная мова, а таксама працэсы ўзнікнення нацыі і стварэння самастойнай дзяржавы” [1, с. 57]. Такім чынам, у аспекце вызначэння сутнасных характарыстык беларускага медыятэксту, акрамя анталагічных рыс медыйнага тэксту як функцыянальнай адзінкі інфармацыйнай прасторы, пытаннем першачарговай важнасці з’яўляецца ўлік моўных і маўленчых фактараў. У гэтай логіцы беларускі медыятэкст, на нашу думку, варта вызначаць як *публіцыстычны твор на беларускай мове, які ў канкрэтны гістарычны перыяд з’яўляецца адлюстраваннем магістральных працэсаў камунікацыі ў грамадстве з улікам цесна звязанай са структурай мовы кадыфікаванай нормы ў якасці выніку сацыяльна-гістарычнага адбору з суіснуючых слоў і форм, якія зафіксаваны ў моўнай плыні, больш распаўсюджаных, агульнапрынятых*.

Фарміраванне, функцыянаванне і развіццё беларускага медыятэксту цесна звязана з эвалюцыяй літаратурнага маўлення і ў першую чаргу, паводле М. Я. Цікоцкага, яго публіцыстычнай разнавіднасцю. Функцыянальная стылістыка аформілася ў якасці самастойнага даследчага напрамку ў лінгвістыцы славянскіх моў у першай палове XX ст., аднак гэта не гаворыць пра тое, што стылістычныя рэсурсы не былі задзейнічаны раней. Улічваючы перарваную традыцыю развіцця беларускай літаратурнай мовы, можна засведчыць той факт, што беларускі медыятэкст адыграў значную ролю ў станаўленні новай літаратурнай формы нашай мовы на пачатку XX ст. і стаў вызначальным фактарам з’яўлення айчыннай стылістыкі як самастойнага лінгвістычнага адгалінавання.

Феномен беларускага медыятэксту генерыраваны афармленнем публіцыстычнага тыпу маўлення і карэлюецца з узнікненнем беларускай журналістыкі як формы грамадскай дзейнасці. Пры гэтым трэба ўлічваць, што

паняцці публіцыстычнага стылю і журналістыкі амбівалентныя, таму пры вызначэнні асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускага медыятэксту, на нашу думку, цалкам лагічна абапірацца на этапы станаўлення беларускай мовы як на базавы фармальны параметр.

Храналогію вызначальных этапаў гісторыі беларускай мовы айчынная лінгвістычная навука фармалізуе праз адпаведную перыядызацыю. У яе аснову пакладзены экстралінгвістычныя акалічнасці як асноўныя фактары фарміравання нацыянальнай камунікатыўнай сістэмы ў гістарычнай перспектыве. “Паколькі аснову развіцця мовы складае развіццё грамадства, гісторыя народа – тварца і носьбіта дадзенай мовы, то і перыядызацыя гісторыі беларускай літаратурнай мовы ў першую чаргу павінна ўлічваць важнейшыя перыяды гісторыі беларускага народа” [2, с. 6]. Пры гэтым адзначаецца, што сувязь мовы з гісторыяй народа “выяўляецца, перш за ўсё, у тым, што само развіццё форм моўных зносін, змены ў функцыянальна-стылявой разнастайнасці мовы цесна звязаны з гістарычнымі зменамі ў аб’ёме, складзе і сацыяльнай сутнасці народа як гістарычнай катэгорыі” [Там жа].

Статус нацыянальнай мовы прадугледжвае як пэўную ступень пашырэння, так і адпаведны ўзровень унутрысістэмнага развіцця. Аснову нацыянальнай мовы фарміруе яе літаратурная (унармаваная і кадыфікаваная) форма. Рэалізаваная ў навуковай, дзелавой, публіцыстычнай, мастацкай і іншых стылістычных разнавіднасцях, яна забяспечвае функцыянаванне ўсіх сфер грамадскага жыцця. З улікам гэтага перыядызацыя беларускай мовы як мовы беларускай нацыі вызначаецца ў сувязі з найважнейшымі этапамі развіцця нацыянальнай грамадска-палітычнай, публіцыстычнай, літаратурна-мастацкай думкі, а таксама з улікам аб’ектыўных гістарычных абставін, што абумовілі яе наяўны стан. У развіцці беларускай літаратурнай мовы трады-цыйна вылучаюцца тры асноўныя перыяды. У розных навуковых працах іх назвы вар’іруюцца, аднак часавыя межы і сутнасць дыферэнцыяльных паказчыкаў, пакладзеных у іх аснову, супадаюць.

1. Агульнаўсходнеславянская (старажытнаруская) літаратурная мова (XI–XIV стст.).
2. Старабеларуская літаратурная мова (XIV–XVIII стст.).
3. Новая (сучасная) беларуская літаратурная мова (XIX ст. – наш час).

Кожнаму з гэтых перыядаў апроч дзяржаўна-палітычных і сацыяльна-эканамічных акалічнасцей адпавядаюць спецыфічныя формы рэалізацыі грамадскай камунікацыі, а таксама спецыфічныя моўныя сродкі яе арганізацыі.

Агульнаўсходнеславянскі перыяд вызначаецца з’яўленнем і актыўным пашырэннем на славянскіх землях розных відаў рэлігійнай і свецка-гістарычнай літаратуры. У гэтых творах закладваліся асновы ўсходнесла-вянскай (у тым ліку і беларускай) публіцыстыкі. Узнікненне першых літара-турных помнікаў, якія ў той ці іншай ступені валодалі адзнакамі публіцыстычнасці, прыпадае на часы існавання Кіеўскай Русі і яе распаду на дробныя княствы. Гэта такія творы, як “Слова аб Законе і Благадаці” мітрапаліта Іларыёна

(сярэдзіна XI ст.), “Казанне пра Барыса і Глеба” (мяжа XI–XII ст.), “Аповесць мінулых гадоў” (пачатак XII ст.), “Слова аб палку Ігаравым” (XII ст.), “Жыціе Ефрасінні Полацкай”, “Жыціе Аўрамія Смаленскага” (канец XII – пачатак XIII ст.) і інш. Названыя помнікі засведчылі пачатак фарміравання сістэмы спосабаў канструявання тэкставых адзінак грамадскага інфармацыйнага абмену, а таксама прынцыпаў адбору маўлен-чых сродкаў рэалізацыі аўтарскай задумы з мэтай найбольш эфектыўнага вырашэння прагматычных задач.

Перыяд старабеларускай літаратурнай мовы характарызуецца канчатковым афармленнем беларускай літаратурнай мовы ў сваіх спецыфічных рысах і храналагічна супадае з працэсам складвання беларускай народнасці ў складзе Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Да літаратурных помнікаў з публіцыстычнымі элементамі ў спосабе выкладу зместу, а таксама з адпаведнымі моўна-стылістычнымі асаблівасцямі можна аднесці “Летапісец Вялікіх князёў Літоўскіх” (XIV ст.), “Беларуска-Літоўскі летапіс 1446 г.” (XV ст.), “Хроніка Літоўская і Жамойцкая” (“Вывод и початок о Великом князстве Литовском и Жмойтском. Отколь взмоглися и пошли”), “Хроніка Быхаўца” (XVI ст.) і інш. Сярод асноўных прыкмет, што вызначаюць ідэйны пафас летапісца як сярэднявечнага публіцыста, даследчыкі згадваюць паслядоўную пазіцыю ў адстойванні дзяржаўнага суверэнітэту Вялікага Княства Літоўскага, самастойнасці ў пытаннях уладкавання гістарычнага лёсу народаў, адзначаецца таксама характэрны тэматычны спектр падзей, якія апісваюцца (унутраная і знешняя палітыка дзяржаў, ваенныя канфлікты ў рэгіёне і ў свеце, сацыяльна-палітычныя і эканамічныя акалічнасці развіцця гарадоў). Стыль беларускіх гістарычных тэкстаў гэтага перыяду вызначаецца хранікальнасцю, аналітычнасцю і ў той самы час мае адзнакі мастацкасці. А мова помнікаў, інтэгравáўшы шматлікія рознаўзроўневыя элементы народнай гаворкі і набыўшы такім чынам вобразнасць жывога размоўнага маўлення, характарызуецца выразнасцю і экспрэсіўнасцю.

Перыяд новай беларускай літаратурнай мовы звязаны з часам фарміравання беларускай нацыі. Тэарэтычнай базай вылучэння гэтага перыяду паслужылі працэсы ідэйна-палітычнага і нацыянальна-культурнага адраджэння, якія пачалі набіраць сілу на беларускіх землях у другой палове XIX ст. і працягнуліся ў XX ст. Найважнейшай асаблівасцю ў аспекце развіцця айчыннага медыятэксту з’яўляецца прамая абумоўленасць названага этапу тэндэнцыямі, што бяруць пачатак у сферы сродкаў масавай камунікацыі. Гаворка ідзе ў першую чаргу пра дзейнасць газеты “Наша Ніва” – грамадска-палітычнага, навукова-папулярнага і літаратурна-мастацкага выдання, якое выходзіла ў 1906–1915 гг. Уклад “Нашай Нівы” ў фарміраванне моўнага забеспячэння функцыянальных стыляў і асобных лексічных пластоў беларускай мовы нельга пераацаніць Публікацыя на старонках выдання матэрыялаў прыродазнаўчай, біялагічнай, медыцынскай, эканамічнай накіраванасці паслужыла магутным штуршком для зараджэння навуковага стылю бела-

рускай мовы. Змяшчэнне разнастайных паведамленняў, аб'яў, праграм, справаздач, зваротаў дазволіла ўвесці ў шырокі грамадскі ўжытак беларускія лексемы і сінтаксічныя канструкцыі, характэрныя для афіцыйна-дзелавога стылю. Закранаючы актуальныя пытанні жыцця таго часу, газета была індыкатарам семантычных, лексічных, словаўтваральных і сінтаксічных працэсаў, што адбываліся ў жывым маўленні ў сувязі з развіццём грамадска-палітычнай думкі, са зменамі ў сацыяльнай палітыцы, прамысловасці, эканоміцы, гандлі, ваеннай справе і г. д. Значны ўклад унесла "Наша Ніва" і ў афармленне корпуса беларускіх тэрміналагічных адзінак у галіне паліталогіі, адміністратыўнага кіравання, справаводства. Спецыфіка публіцыстычнага газетнага маўлення, заснаваная ў тым ліку і на эмацыйным уздзеянні на чытача, стала падмуркам для фарміравання на базе народна-гутарковых рэсурсаў такіх лексіка-семантычных пластоў новай беларускай мовы, як абстрактныя, памяньшальна-ласкальныя, экспрэсіўна-ацэначныя словы. На прыкладзе газеты "Наша Ніва" мы сутыкаемся з магчыма ўнікальнай сітуацыяй: дзейнасць асобнай медыяструктуры на працягу нязначнага ў гістарычнай перспектыве часу (меней за 10 гадоў) на базе сістэмы вусна-гутарковай камунікацыі з дастаткова размытымі ў сілу экстралінгвістычных прычын межамі і правіламі дазволіла закласці лінгвістычныя асновы літаратурнай формы нацыянальнай мовы і акрэсліць базавыя прынцыпы яе ўнармавання. Пазней, на працягу XX ст., у межах трэцяга перыяду развіцця беларускай мовы, айчынны медыйны тэкст атрымаў пашырэнне ў выглядзе тэксту радыё, тэлебачання, інтэрнэту. І ва ўсіх названых разнавіднасцях ён аказваў, аказвае і, відавочна, будзе аказваць істотны ўплыў не толькі на узус, але і на літаратурную норму.

Такім чынам, цесная ўзаемная сувязь медыятэксту і нацыянальнай мовы ў яе літаратурнай форме відавочная. Беларуская мова з'яўляецца адным з ключавых рухаючых фактараў развіцця айчыннага медыятэксту. А апора на храналагічную сістэматызацыю гістарычных этапаў фарміравання беларускай літаратурнай мовы пры навуковым разглядзе эвалюцыі тэкстаў масмедыя дае грунтоўную тэарэтыка-метадалагічную базу, якая інтэгруе як сістэмна-лінгвістычныя, так і гістарычныя фактары.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Слука, О. Г.* Идеология информационного пространства Республики Беларусь / О. Г. Слука // Весн. Бел. дзярж. ун. Сер. 4. Філалогія. Журналістыка. Педагогіка. – 2010. – № 2. – С. 56–60.

2. *Шакун, Л. М.* Нарысы гісторыі беларускай літаратурнай мовы : дапаможнік для студэнтаў філалагічных факультэтаў ВНУ / Л. М. Шакун. – Мінск : Дзярж. вуч.-пед. выдавецтва Міністэрства асветы БССР, 1960. – 222 с.